Przesyłka opłacona ryczałtem

Nr 3 Чацьверг, 18-га Лютага 1926 г. м. Вільня Год I

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.—Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырокі дэмакратызм. — Барацьба з комунізмам. — Нацыянальная царква. — Краёвая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Надпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ 3 „ 2 зл. 50 гр.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno; ul. Niemiecka 1 Hotel „Sokołowski" pokój Nr 23. Рэдакцыя адчынена ад 12 — 2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр сярод тэксту — 25 гр. і на апошняй стр.—15 гр. за радок.

ПЕРШЫ КРОК.

Выступаючы год назад на арэну актыўнага палітычнага і грамадзкага жыцьця, нашая група, паміж іншых пунктаў сваей праграмы, выставіла лязунг польска беларускай згоды.

Мы ўжо нираз, у газэтных артыкулах, парушалі гэты пункт нашае праграмы. Ў гэтых артыкулах мы прызывалі польскую дэмакратыю пайсьці на сустрэчу неабходным і законным жаданьням і патрэбам беларускага народу. Мы падыходзілі да гэтага пытаньня ня толькі з пункту гледжаньня, гэтак кажучы, асабістай беларускай карысьці, але і з пункту гледжаньня агульнага дабра, як для беларускага народу, гэтак і для Дзяржавы.

Нажаль, мы павінны прызнацца, што апрача некалькіх выняткаў, гэты наш голас — быў голасам "вапіюшчага ў пустыні". І, калі ня лічыць спробы Тугута разрубіць „гордзіеў вузел" пытаньня аб меншасьцях, дык можна напэўна сказаць, што польская дэмакратыя, як цэлае, нашага голасу ня чула. Нам скажуць: а соймавыя пратэсты, а прамовы, пекна надрукаваныя брашуркі? Так, усё гэта было, але далей пекных слоў і брашуркаў справа не йшла.

Аднак, мы ўсёж-ткі цьвёрда верылі, што нарэшце, зразумеўшы *агульную карысьць*, польскае грамадзянства павінна *чынна* пайсьці на спатканьне беларускаму грамадзянству.

Праўда, апошнія гады былі для нас — беларусаў вельмі цяжкімі. Самаволя месцовых „кацыкаў", крыўды на кожным кроку, зьнішчэньне беларускай школы, зьдзекі паліцыі, а ў дадатак да ўсяго гэтага немагчыма вялікія падаткі — ўсё гэта вострымі цьвікамі ўбівалася ў грудзі зруйнованага войнамі і абяднеўшага беларускага селяніна.

Беларускі Пасольскі Клюб (нябошчык) замест таго, каб рэальна заняцца гэтымі балючымі пытаньнямі, пачаў гуляць у „вялікую палітыку", у рэвалюцыі", дыктатуру пралетарыята" і іншыя „планетарные" забавы. — А ў гэты самы час беларускі народ, які застаўся без ніякае абароны аканчальна гінуў. Пасьля-ж таго, як частка клюбу (Сялянска-Работніцкая Грамада) зусім адкрыта перайшла ў лагер заклятых ворагаў Польшчы – бальшавікоў, сытуацыя яшчэ больш пагоршылася. Дзякуючы гэтаму ўзмацнілася недаверра да беларускага грамадзянства нават з боку польскай дэмакратыі.

З свайго боку, мы заўсёды цьвердзілі, што палітычныя імкненьні комунізуючых паслоў з „Грамады" зусім не адпавядаюць жаданьням і настроям беларускага народа. І здаецца што за год упартай працы, нам удалася нарэшце праканаць польскае грамадзянства ў тым, *што па некалькім комунізуючым паслам нельга судзіць аб усіх беларусах і нельга дзеля гэтага лічыць увесь беларускі народ — бальшавікамі.*

На гэтых днях, у Горадні, адбыўся польскі краёвы зьезд. І вось на гэтым зьездзе мы ў першы раз, за доўгі час, пачулі праўдзівыя словы польскай дэмакратыі. Словы аб патрэбе незабаўнай напраўкі надзвычай цяжкіх варункаў жыцьця беларускага народа. Мы пачулі з вуснаў віленскага дэмакрата п. Сьвяхоўскага слова аб патрэбе даць беларусам магчымасьць вольна будаваць сваю нацыянальную школу. Мы бачылі, што значнай большасьцю галасоў (крэсавых дэмакратаў) была прынята рэзалюцыя пасла п. Хамінскага аб тым, каб парцэляцыя зямлі для іншых наступіла толькі пасьля таго, як будуць заспакоены зямельныя патрэбы мясцоваго сялянства. Гэтая рэзалюцыя яскрава паказала як нашыя Сойм і Сэнат адарваліся ад жыцьця, абедзьве палаты гэты прынцып у свой час адкінулі.

Гэткім чынам на гарадзенскім зьездзе, былі выказаны добрыя пажаданьні. Але, зразумела, што гэтыя жаданьня толькі тады будуць карыснымі, калі за імі наступяць чыны. А беларускі народ ужо шмат разоў чуў пекныя словы, але... чынаў яшчэ ня бачыў! Дык незабаўных чынаў мы чакаем! І мы пэўны, што яны хутка прыдуць. А супольнымі высілкамі польскага і беларускага грамадзянства будзе зломлены той кітайскі мур узаемнага недаверра, які вырас за апошнія гады паміж беларускім і польскім грамадзянствам. Гэта будзе і для нашай і для Вашай карысьці.

Палітычны агляд.

У апошні час даецца заўважыць значнае палепшаньне адносінаў паміж Польшчай і С. С. Р. Р. Усё гэта дзеецца быццам на эканамічным грунце, на грунце гандлёвых зносінаў, але што тычыцца бальшавікоў, дык яны заўсёды і ўсюды перш за ўсё маюць палітычныя мэты.

Пачатак гэтага зближэньня з Польшчай зрабіў Чычэрын сваім візытам у Варшаве, маючы выразную мэту разьбіць Лёкарно. А пасьля лёкарнскага дагавора і выступленьня Нямеччыны у шмат якіх пытаньнях разам з сусьветнымі вялікімі дзяржавамі, Саветы пастанавілі аканчальна зьмяніць сваю палітыку ў адносінах да бліжэйшага свайго заходняго суседа. Плёнам гэтага збліжэньня зьяўляецца арганізаваньне польска савецкай гандлёвай палаты, якое ў Варшаве спаткалася з вельмі гарачым прыёмам. Савецкіх дэлегатаў возяць па розных гарадах, знаёмяць іх з палажэньнем прамысловасьці і робяць для іх шыкарныя прыёмы. Адначасна з гэтым дэпутат Быль і Ко, нядаўна, прыехаўшыя С. С. Р. Р., езьдзяць па Польшчы, чытаюць лекцыі аб тым, што яны бачылі і чулі ў „Савецкім раі„, ўсё гэта прадстаўляючы ў асбалівым сьвятле. А бальшавікам гэтага толькі і трэба. Пад відам „гандлю", яны маюць толькі агітацыйныя мэты. Калі нельга узарваць нейкую дзяржаву звонку, яны лезуць сюды пад відам гандлёвых місыяў і агэнтаў, прыкідваюцца прыяцелямі, каб узарваць яе ўнутры. Ня так, дык гэтак. Асабліва-ж удзячны грунт для бальшавіцкай прапаганды прадстаўляе цяпер Польшча, якая пераживае надта войструю форму эканамічнага крызіса і мае шмат безработных. Паскольку падатлівы элемэнт для бальшавіцкай агітацыі прадастаўляюць безработныя, відаць з нядаўніх падзеяў у Калішы, дзе агэнты бальшавікоў і аднадумцы Брыля піхнулі масу рабочай моладзі да неразумных актыўных выступленьняў, рэзультатам якіх было колькі ахвяраў цяжка і лёгка раненых. Што-ж датычыцца гандлю, на які спадзеваецца Польшча, дык з імі можа быць толькі адзіны гандаль— гэта замена палітычных ліхадзеяў у Польшчы на бязвінных польскіх грамадзян, якія зачынены ў савецкіх вастрогах. І гэты „тавараабмен" ужо пачаўся. У Столбцах бальшавікам аддадзены важны палітычны ліхадзей савецкі шпіон Леон Брун, аб якім не закончана яшчэ судовае сьледзтва, на замену за ксяндза Усаса і Лашкевіча, засуджаных бальшавікамі на сьмерць. І апрача гэтага „заменнага" гандлю бальшавікі яшчэ будуць „экспорціроваць" у Польшчу разам з арміяй агітатараў і паджыгацеляў масу агітацыйнай літэратуры, аружжа і ўзрыўчатых матэрыялаў. Гэта адзін іхні тавар для экспорту за граніцу.

У апошні час з дня на дзень чакалі прызнаньня Чэха-Словакіяй Савецкага ўраду. Чэскі ўрад, асабліва міністар Бэнэш, соцыяліст, даўно маюць сымпатыі да савецкага ўраду. А гандаль Чэха-Славакіі з С. С. Р. Р. ужо даўно ў шмат разоў перавышае разьмеры польска-савецкага гандлю, ня гледзячы на тое, што Чэха-Славакія далей ляжыць ад Саўдэпіі за Польшчу. Але асабліва ўзмацавалі гэту сымпатыю чэскага ўраду да бальшавікоў апошнія выбары ў Чэхіі, на якіх выявілася перамога комуністаў і апошняе польска-савецкае зблiжэньне, да якага чэхі адносяцца з зайздрасьцю. А для бальшавікоў надта важна, каб узмацаваць прыязьнь з Чэха Славакіяй, дзе яны думаюць заснаваць базу для заходня-эўрапэйскай прапаганды. Толькі дзеля гэткіх імкненьняў бальшавікоў спыніліся перагаворы з чэскім урадам аб прызнаньні савецкага ўраду, да чаго ўжо былі зроблены ўсе неабходныя падгатаўленьні з абодвых бакоў. Бальшавікі дамагаліся, каб у Чэха-Славакіі была гэткая лічба консульстваў якая зусім не патрэбна. Нават для найбольш наіўных было ясна, што пад гэтымі консульствамі і гандлёвымі прадстаўніцтвамі трэба разумець чыста агітацыйныя пункты. Чэха-Славакія гэта ўцяміла ды ізноў адлажыла прызнаньне Саветаў *de jure*, ня гледзячы на тое, што ей надта патрэбны гандлёвыя зносіны з бальшавікамі.

Паскольку зьяўляецца небясьпечным для сьвета нацыяналістычны шовінізм, відаць з конфлікта між Італіяй і Нямеччынай які прыняў надта грозны характар. Афіцыяльным поводам гэтага конфлікта было быццам прасьледаваньне нямецкай нацыянальнай меншасьці ў палудзенным Тыролі, адышоўшым паводле С.-Жэрмэнскага дагавора да Італіі. Але запраўднай прычынай італьянска-нямецкага антаганізма ёсьць узмацаваньне італьянскай экспансіі на Балканах і ўсходняй частцы Сяродземнага мора, у той час як Нямеччына таксама дабіваецца гэтых рынкаў. Першым крокам Нямеччыны да выхаду да Адрыятычнага мора было-б прылучэньне Аўстрыі да Нямеччыны, што зьяўляецца толькі справай часу. Палітычнай граніцы між Нямеччынай і Аўстрыяй амаль што зусім няма: няма заграничных пашпартоў, візаў пры пераездах у Аўстрыю і Нямеччыну. Падпісана гандлёвая вунія. Застаецца толькі зрабіць апошні афіцыяльны акт дабравольнага злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай. Гэтага больш за ўсё баіцца Італія. На грунце гэтага страха і пачаўся апошні конфлікт. Нямецкая прэса ўжо даўно вядзе кампанію проці Муссоліні, які быццам прасьледуе нямецкае насяленьне палудзеннага Тыроля А пасьля

АБВЕСТКА.

Усіх нашых паважаных чытачоў, якім высылаюцца пробныя нумары „Беларускага Слова“, паведамляем што таму, хто не паклапаціцца прыслаць падпіску, высылка газэты будзе спынена.

Выпісаць газэту можна праз бліжэйшую пошту, або прыслаць падпіску да адміністрацыі.

войстрай прамовы баварскага прэмьера Гэльда, скіраванай проці Італіі, Муссоліні гэтак адказаў, што пры іншых умовах можна было спадзявацца разрыва дыплёматычных зносінаў, а навет вайны. Ён зусім выразна сказаў, што, калі гэта трэба будзе дык ён можа перанесьці італьянскі сьцяг на поўнач Тырольскай граніцы. Немцы, ведама, не напалохаліся ад гэтых пагрозаў, але выкарысталі неасьцярожнае выступленьне ваяўнічага Муссоліні з мэтай прадставіць яго ў вачох Эўропы ў адпаведным асьвятленьні. Нямецкі міністар заграмічных справаў адказаў на гэту прамову Муссоліні вельмі спакойна, заяўляючы, што нямецкі ўрад не падтрымоўвае газэтнай кампаніі проці Італіі і што ўладжаньне гэтага конфлікта ўваходзіць у компэтэнцыю Лігі Народаў. Немцы сьвядома хочуць перанесьці гэты конфлікт на арэну Лігі Народаў, якая ўжо мела магчымасьць раз пераканацца ў ваяўнічасьці Муссоліні, у часе конфлікта з Грэцыяй. Што-ж датычыцца падтрыманьня з боку Лігі Народаў, дык Нямеччына ў гэтым не сумлеваецца, дзеля таго, што цяпер вядуцца самыя гарачыя прыгатаўленьні, каб прыняць яе ў Лігу. Нямеччына ўжо падала заяву аб прыняцьці яе ў Лігу. 12 лютага было склікана спэцыяльнае паседжаньне Рады Лігі па гэтаму пытаньню і вызначаны час, калі мае быць склікана спэцыяльнае паседжаньне агульнага сходу Лігі дзеля аканчальнага вырашэньня гэтага пытаньня. Уваход Нямеччыны ў Лігу Народаў, таксама як і Лёкарнскі дагавор, зьяўляецца гістарычнай падзеяй у палітычным жыцьці Эўропы. Справа ў тым, што Ліга Народаў складаецца з агульнага сходу, які зьбіраецца кожны год адзін раз, або па спэцыяльнаму вызначэньню Рады Лігі, якая зьбіраецца дзеля вырашэньня важнейшых пытаньняў. Рада Лігі складаецца з пастаянных сябраў, лікам 4 (Англія, Францыя, Японія і Італія) і часовых. Усе пытаньні ў Радзе Лігі вырашаюцца аднагалосна. Нямеччыне, як вялікай дзяржаве, абецана пастаяннае месца ў Радзе Лігі. Дзякуючы гэтаму яна атрымае магчымасьць асабіста мець уплыў на палітычнае жыцьцё Эўропы. Статут Лігі Народаў пазваляе закратываць пытаньні аб пераглядзе існуючых дагавораў, выпаўненьне якіх пагражае міру (19-ы параграф), бараніць нацыянальныя меншасьці ў іншых дзяржавах, вырашаць розныя конфлікты кшталтам цяперашняга італьянска-нямецкага. І Нямеччына думае зараз-жа пасьля ўваходу ў Лігу закрануць цэлы рад гэткіх пытаньняў. Наагул Ліга Народаў зьмяняе свой ранейшы характар ад мамэнту ўваходу Нямеччыны. Дзякуючы гэтаму і маральны аўторытэт Лігі, як міжнароднага органа, значна ўзмацоўваецца.

N.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

У Польшчы.

— Замест вышаўшага ў адстаўку мін. Марачэўскага, партыя П. П. С. дэлегавала ў склад ураду пасла Барліцкага, які заняў становішча міністра працы.

— Перагаворы аб пазычцы ў Амэрыцы пад заклад тытунёвай манаполіі ідуць памысна. Пытаньне аканчальна будзе вырашана ў красавіку г. г.

— У Калішы 10 г. м. безработныя зрабілі дэманстрацыю перад магістратам. Прычынай дэманстрацыі было зьменшаньне запамогаў, якія магістрат выдаваў безработным. Калі дэманстрантам прыгразілі разгонам, дык яны кінуліся ў магістрат, пабілі прэзыдэнта места, разграмілі канцэлярыю магістрата і ранілі некалькіх паліцэйскіх ахвіцэраў. Пасьля гэтага былі яшчэ спробы нападу на турму з мэтай звальненьня палітычных, а таксама на казармы паліцыі. Для разгона дэманстрантаў было ўжыта войска. У рэзультаце — ранена каля 30 чалавек работнікаў і паліцыянтаў. На другі дзень ізноў была дэманстрацыя безработных. Пры разгоне ранена 5 чалавек. Паміж іншым у часе дэманстрацыі быў пабіты пасол Галавач.

— Паседжаньня пленуму Сойму адложаны да 25 г. м.

— У Міністэрстве аграрнай рэформы ідзе падгатаўка да выкананьня закону аб аграрнай рэформе.

— Памёр прымас Польшчы кардынал Дальбор.

— На Шлёнску раскрыта вялікая нямецкая шпіонская афэра. Верхавод Лямпрэт павесіўся ў турме. Скампрамітавана шмат нямецкіх выдатных дзеячоў.

— Маршалак Я. Пілсудскі цяжка захварэў. Была нават небясьпека, што будзе запаленьне лёгкіх, але небясьпека гэтая прайшла.

— Лік безработных за час ад 30 студня да 6 лютага г. г. павялічыўся на 3.191 чалавек. Усяго ў Польшчы налічваецца 362.310 безработных.

За граніцай.

Францыя. Для замірэньня Сірыі Жувэнэль прапануе: 1) Стварыць у Сірыі фэдэрацыю малых аўтаномных дзяржаваў, і 2) Аб'еднаць гэтыя дзяржавы праз ўзаемны гарантаваны дагавор бясьпекі на 30 гадоў.

— **Англія.** Пытаньне аб Масулю, які як ведама прызнаны Лігай за Англіяй, дасюль аканчальна не вырашана і Масуль застаецца тымчасам пры Турцыі.

— Адбылася нарада Міністраў працы Англіі, Бэльгіі, Францыі, Нямеччыны і Італіі па пытаньням аб акрэсьленьні ліку рабочых гадзін.

— Па газэтным чуткам Урад апрацаваў праэкт аб зьменшаньні выдаткаў, як паміж іншым прадбачыць права дэпутатаў на праезд па чугункам толькі у 3-й клясе.

— **Нямеччына.** Уся ўвага скіравана на пытаньне аб уваходзе ў Раду Лігі Народаў. Ад мамэнту ўваходу Нямеччына атрымае 30 месцаў ў Сэкрэтарыяце Лігі. Праэкт Францыі аб уваходзе ў Раду Лігі пастаяннага сябра, Польшчы выклікаў гарачы пратэст з боку Нямеччыны.

— **Кітай.** Па апошнім весткам у цэнтральных провінцыях Кітая пачаўся голад.

— У Шанхаі паўстала новая арганізацыя — „Ліга абароны“, у якую ўваходзяць кітайскія кансэрватары, а такжа інастранцы. Ліга ставіць заданьнем барацьбу ў міжнародным разьмеры з III інтэрнацыяналам.

— Рэвалюцыйныя арміі не маюць пасьпеху. Разам з гэтым зьменшаецца і рэвалюцыйна бальшавіцкі рух.

— **Гішпанія.** Ў зьвязку з праэктам ўвахода Польшчы сталым сябром у Раду Лігі Народаў, — такое-жа месца патрабуе сабе і Гішпанія.

— **Швэйцарыя.** Перагаворы з С. С. Р. Р. ніяк ня могуць наладзіцца, бо Швэйцарыя стаіць цьвёрда пры ўсіх сваіх жаданьнях.

— **Чэхаславакія.** Прызнаньне С. С. Р. Р. de jure адложана.

— **Амэрыка.** Забастоўка каменаўгольных работнікаў, якая цягнулася з верасьня мінулага году закончылася. Гэта забастоўка прынясла стратаў на 200 міліёнаў фунтаў штэрлінгаў.

— **Мэксыка.** Тут пачаўся рух проці духавенства. Маемасьць канфіскована. Часьць духавенства-гішпанцы высяляюцца за межы дзяржавы.

— **Латвія.** Забілі тут двух бальшавіцкіх дыплёматычных агэнтаў. Гэтае здарэньне амаль ня вызвала конфлікту паміж Латвіяй і С. С. Р. Р.

Польскі краёвы зьезд у Горадні.

(Другі дзень).

Напружаная атмасфэра першага дня, калі паўставала нават пагроза поўнага правалу зьезда, на другі дзень трохі супакоілася. Апрача тэй групы дэлегатаў, якая пакінула зьезд у першы дзень, рэшта засталася да канца. Толькі рэзалюцыя ў справе зямельнай рэформы, якую запрапанаваў п. Хамінскі, выклікала спрэчкі і обструкцыю правіцы. Аднак рэзалюцыя гэтая была прынята з папраўкай п. Рдултоўскага ў п. 4. Вось гэтая рэзалюцыя:

„Зьезд прадстаўнікоў польскіх грамадзкіх і гаспадарчых арганізацыяў ўсходніх земляў сьцьвярджае, што спэцыфічныя асаблівасьці аграрнага ладу на ўсходніх землях, а таксама стварыўшагася там парадку ўладаньня, вымагаюць прысьпешаньня направы зямельнага пытаньня на гэтых землях. Зьезд, прымаючы пад увагу: а) што на абшары Польшы не павінна істнаваць забароны для грамадзян якой-небудзь вокругі купляць зямлю, b) што наагул у Польшчы не павінна істнаваць ніякіх абмежаваньняў, ані клясавых, ані нацыянальных,— дамагаецца ад установаў законадаўчых і ўрадавых застасаваньня пры праведзеньні аграрнай рэформы наступных прынцыпаў:

1) Комасацыя зямлі павінна быць па магчымасьці энэргічна і хутка пашырана, пры адначасным правядзеньні ліквідацыі сэрвітутаў і прырэзцы суседняй зямлі, якая будзе атрымана з зямельнай рэформы.

2. Сэрвітуты павінны быць якнайхутчэй зьліквідаваны на падставе новелы да ўставы, якая павінна быць найхутчэй праведзена і якая давала-бы вялікшыя карысьці перадусім для гаспадарак дробных (karłowatych).

3. Дробныя арэндатары павінны атрымаць запраўдную магчымасьць дзеля выкупу арэндаванай зямлі, апрача таго з гэтага права павінны карыстаць і ўсе дробныя прадваенныя арэндатары.

4. Пры правядзеньні зямельнай рэформы, перадусім трэба заспакоіць патрэбы *месцовых* вясковых ахвотнікаў і малазямельных гаспадароў суседніх вёсак“.

Трэба адзначыць прыемны факт, што за гэтую рэзалюцыю галасавала нават месцовая „крэсовая“ правіца і асаднікі, якіх шмат было на зьездзе і большасьць якіх пры галасаваньні далучылася да дэмакратыі. З гэтага відаць, што навет польскія асаднікі ня гледзячы на ўсе высілкі правіцы і на пастановы Сойма і Сэната, лічаць *што новых асаднікаў можна пусьціць на „крэсы“ толькі пасьля таго, як будзе надзелена зямлей месцовае сялянства.* Пасьля гэтага зьездам была пры-

Бальшавікі і царква.

Комунізм у сваей тэарытычнай аснове анты рэлігійны, згодна формулы, якая „красуецца“ на крэмлеўскіх сьценах Масквы: „рэлігія опіум народаў“. І на практыцы комуністычная партыя, ўвесь час свайго істнаваньня, змагаецца з рэлігіяй. Дзеля таго ж, што большасьць народаў Расеі складаюць праваслаўныя: расейцы, украінцы і беларусы, дык усю сваю увагу бальшавікі зьвярнулі на праваслаўную царкву і пачалі проці яе страшэннае ганеньне. Перад тым, што перажыла і перажывае праваслаўная царква ў Саўдэпіі пад бальшавіцкай уладай бляднеюць самыя страшэнныя часы ганеньня першых хрысьціян у Рыме, пры Нэроне, Дэклетыяне і інш.

Каб лягчэй было расправіцца з царквой, бальшавікі перш-на-перш аддзялілі яе ад дзяржавы. Яны забаранілі выкладаць ў школах Закону Божага, забаранілі таксама навучаньне рэлігіі і ў дому. Яны павыкідвалі абразы са ўсіх школаў і ўрадовых установаў. Яны натраўліваюць разбэшчаных і маральна скалечаных дзяцей—комсамольцаў, каб тыя выкідалі абразы нават з хатаў сваіх бацькоў. Замест хрысьціянскага „таінства хрышчэньня“ яны ўвялі „акцябрыны“, гэта значыць замест таго, каб дзіця хрысьціць, яго пасьвяшчаюць комуне. Робіцца гэта так, што ў часе ўрачыстага паседжаньня дзіця пакрываецца чырвоным „сьцягам“ і „акцябрына“ зроблена. Пры гэтым дзецям даюцца зусім дзікія імёны, як напр.: „Октябр“, „Рэвалюцыя“, „Марксіст“ і г.д.

Хрысьціянства, як рэлігія, вучыць любіць свайго бліжняга. Бальшавікі-жа кажуць, што гэтая любоў зусім непатрэбна, а што трэба наадварот *умець ненавідзець.* І бальшавікі гэтак ненавідзяць хрысьціянства і Хрыста, што гэтая шалёная ненавісьць даводзіць іх да таго, што яны робяць культ таго, хто прадаў Хрыста. Яны паставілі памятнікі Юдзе-прадацелю ў Зьвенігародзе і ў Пермі. Яны выдаюць агідныя антырэлігійныя журналы „Бязбожнік“, „Непрызнаньне Бога“ і інш., у якіх закідваюць балотам ўсё, што ёсьць сьвятога для хрысьціяніна. Яны вешаюць у цэрквах плякаты: „Далоў Бога“, „ні Бога, ні чорта“ і г.д.

Бальшавікі прымусілі матросаў балтыцкага флёта галасаваць па пытаньню: ці ёсьць Бог? Дзьве трэціх часткі ўсіх цэркваў бальшавікі перарабілі ў казармы, кіна, клюбы і інш. Зруйнавалі манастыры, надругаліся над сьвятынямі, а мошчы сьвятых перадалі ў музэі.

Аднак жа, ня гледзячы на ўсе гэтыя праследаваньня, хрысьціянства ў Саўдэпіі ня толькі не падае, а наадварот усё больш і больш расьце і ўзмацняецца. Ніколі яшчэ цэрквы ня былі гэтак перапоўнены народам у часе службы, як цяпер і ніколі гэтак горача не маліліся хрысьціяне, як цяпер у Саўдэпіі.

У часе вялікіх хрысьціянскіх сьвятаў Вялікадня і Нараджэньня Хрыста, бальшавікі арганізуюць антырэлігійныя дэманстрацыі і паходы комсамольцаў. Але, апрача горсткі здэмаралізаваных хуліганаў-комсамольцаў, ніхто ў гэтых дэмонстрацыях вучасьця не прымае, а гнусныя комуністычныя сьпевы комсамольцаў гінуць у магутным „Хрыстос Уваскрос!“ Нарэшце, баючыся народнай расправы з комсамольцамі, бальшавікі прымушаны былі забараніць антырэлігійныя комсамольскія дэманстрацыі каля цэркваў.

Захапіўшы ў свае рукі ўладу, бальшавікі перш на-перш забаранілі сьвяткаваньне ўсіх хрысьціянскіх сьвятаў. Але, ня гледзячы на гэтую забарону, народ не перастаў іх сьвяткаваць. І бальшавікі змушаны былі пайсьці на ўступкі. У 1925 годзе яны, нібыто з прычыны „новага курсу“ ў адносінах да царквы, дазволілі сьвяткаваць Вялікдзень і Нараджэньне Хрыста. Але гэтым „новым курсам“ яны хацелі толькі ўнясьці раскол у царкву, каб лягчэй было яе разваліць знутры. Дзеля гэтага яны стварылі новую, савецкую царкву; г. зв. „жывую цэркаў“, якая прызнала савецкую ўладу і пачала барацьбу з праўдзівай праваслаўнай царквой. „Жывацаркоўцы“ прызналі

нята агульная рэзалюцыя наступнага зьместу:

„Зьезд прадстаўнікоў Польскай Грамадзкай Працы на Усходніх Землях у Горадні ад 6 і 7 лютага 1926 г. пастанавіў:

1. Найлепшым шляхам для асягненьня згоднага сужыцьця насяленьня ўсходніх земляў і палепшаньня гаспадарчых і культурных варункаў жыцьця гэтых земляў, — зьяўляецца нашырэньне грамадзкіх і гаспадарчых арганізацыяў з уваходам у іх усіх слаёў насяленьня без розьніцы рэлігіі і нацыянальнасьці. Дасюлешняе парлямэнцкае прадстаўніцтва гэтых земляў, разьбітае на партыі, ня можа паразумецца між сабой нават па галоўным супольным гаспадарчым пытаньням і дзеля гэтага не дае ніякай гваранты, што слушныя жаданьні насяленьня ўсходніх земляў будуць споўнены. Дзеля гэтага, а таксама ў мэтах устанаўленьня аднальковасьці ў нашай дзяржаўнай палітыцы, дзеля абароны інтарэсаў усіх слаёў насяленьня, пастанаўляе арганізаваць сталае надпартыйнае прадстаўніцтва ў Варшаве.

2. Прадстаўніцтва гэтае павінна быць створана шляхам паразуменьня грамадзкіх і самаўрадавых арганізацыяў, перадусім на абшарах паветаў, пасьля ў ваяводзтвах, а нарэшце паміж ваяводзтвамі.

3. Зьезд заклікае ўсе грамадзкія і самаўрадавыя арганізацыі на абшары ўсходніх земляў да незабаўнага стварэньня гэтай арганізацыі; пры гэтым выбарную ардынацыю для розных катэгорыяў арганізацый павінна ўстанавіць Часовая Рада грамадзкіх і гаспадарчых арганізацыяў.

4. Да часу стварэньня Рады хаўрусаў грамадзкіх і гаспадарчых арганізацыяў усходніх земляў, зьезд творыць Часовую Раду Грамадзкіх і Гаспадарчых Арганізацыяў Усходніх Земляў, у складзе 15 сяброў і 5 заступнікаў, якая будзе спаўняць свае абавязкі да часу склікаеньня наступнага зьезду, які павінен адбыцца ў чэрвені г. г Рада мае права каапта цыі сяброў да агульнага ліку 21, ня лічачы заступнікаў“.

Пасьля гэтага адбыліся выбары ў Часовую Раду польскіх грамадзкіх і гаспадарчых арганізацыяў, у склад якой увайшлі: п. п. П. Бенеўскі (Валынь), Цытажыньскі (Горадня), Гэншэль (Наваградак), Іокіш Кшыжаноўскі (Вільня), Ледніцкі (Вільня), Лашкевіч (Горадня), біскуп Лазінскі, Мальскі (Вільня), Оленінскі, Асмалоўскі (Палесьсе), Пшэдпельскі, Станевіч, Камінскі (Вільня), і Сапега (Горадня). Заступнікамі: Абрамовіч Драч і Аб'язерскі (Вільня).

Зьезд пастанавіў выслаць прывітальныя дэпэшы Прэзыдэнту Рэспублікі і маршалку Пілсудскаму.

Альфа.

Агляд прэсы.

У № 32 „Kur. Wil.“ зьмешчана вельмі цікавая, асабліва для нас беларусаў, прамова прадстаўніка віленскай польскай дэмакратыі п. Сьвяхоўскага, на польскім краёвым зьезьдзе ў Горадні ад 6 лютага г. г. У гэтай прамове п. Сьвяхоўскі абгаварвае вельмі балючае ў Польшчы пытаньне аб нацыянальных меншасьцях і між іншым кажа:

„Галоўнай прычынай няўдачы польскай дзяржаўнай палітыкі на літоўска-беларускіх і ўкраінскіх землях,— ёсьць дастасаваньне пры будаваньні дзяржавы, якая населяна рознымі народамі,— доктрыны нацыянальна адналітай дзяржавы.

Сучасная Польшча, ня гледзячы на 150-гадавую пярэрву ў яе дзяржаўным жыцьці, зьяўляецца працягам чыннага разьвіцьця тэй самай супольнай Польшчы, якая калісь паўстала з самахотнай умовы, населяючых яе народаў. Ня гледзячы на тое, што па Рыскаму трактату Польшча страціла на Ўсходзе палову сваіх абшараў, яна і цяпер яшчэ мае трацiну няпольскага насяленьня, якое кампактнай масай заселяе палову ўсей яе тэрыторыі, і нельга нават вызбразіць сабе магчымасьць упраўленьня ў сучасных варунках гэткімі вялікімі абшарамі, якія займаюць беларускія і ўкраінскія землі, без супрацоўніцтва ў гэтым упраўленьні насяленьня, якое зьяўляецца большасьцю на гэтых абшарах“.

І далей:

„Польшча бяз творчага супрацоўніцтва ўсіх населяючых яе народаў, а галоўным чынам украінцаў і беларусаў, нармальна разьвівацца і ўзмацоўвывацца ня можа. Ад зьдзейсьненьня гэтай мэты будзе залежаць сіла, павага і разьвіцьцё дзяржавы Аднак-жа самахвотнае і суменнае супрацоўніцтва над устанаўленьнем дзяржаўнага ладу сучаснай Польшчы і ахвотнае выпаўненьне, патрэбных для ўтрыманьня гэтага ладу, цяжараў і абавязкаў усімі грамадзянамі — магчыма толькі пры роўнасьці правоў, як'я Польшча дае сваім грамадзянам“.

Зазначыўшы далей патрэбнасьць поўнай дэцэнтралізацыі ў упраўленьні гэтымі абшарамі п. Сьвяхоўскі кажа:

„Дзеля гэтага мы павінны прызнаць што адзіным рашэньнем праблемы.... мог бы быць, згодны з конституцыяй, шырокі месцовы самаўрад у пастаці тэрыторыяльнай аўтаноміі, дастасаванай да вымаганьняў месцовага жыцьця“.

У канцы, п. Сьвяхоўскі падае гэткі праэкт аздараўленьня „крэсавага“ жыцьця:

„Мы павінны сьцьвердзіць, што заправднымі і грунтоўнымі варункамі для аздараўленьня адносінаў на Ўсходніх землях, без правядзеньня якіх у жыцьцё нельга стварыць на гэтых землях нармальных абставінаў і моцна зьвязаць гэтыя зямлі з рэштай Польшчы, ёсьць:

Прыцягненьне да дзяржаўнага супрацоўніцтва ўсіх народаў, якія жывуць у Польшчы, на падставе праўдзівай (а ня толькі на паперы) роўнасьці ўсіх, а таксама дэцэнтралізацыя ўпраўленьня гэтымі землямі“.

З прыемнасьцю зьмешчаючы на сваіх шпальтах прамову гэтага праўдзівага польскага дэмакрата, мы хацелі-б, каб гэтыя словы былі ня толькі асабістым поглядам п. Сьвяхоўскага, а поглядам усей польскай дэмакратыі.

У С.С.Р.Р.

Рэзультаты выбараў.

Як ні стараюцца комуністы паказаць свой „твар“ вёсцы, сялянам нешта ен не надта падабаецца. Ня гледзячы на шалёную агітацыю, на'т пагрозы, партыйцаў і комсамольцаў сяляне ня пушчаюць да ўрадаваньня на вёсцы. Апошнія выбары ў сельсаветы паказалі, што ніякіх „твараў“ сяляне ня хочуць. Ня хочуць таксама выбіраць чужынцаў. Вось данныя па некатарым раёнам:

Бешэнковіцкі раён (Віцебскі вокруг): комуністаў прайшло 5,9 прац. комсамольцаў 11,8 пр. *безпартыйных 82,3 прац*. Інтэлігэнцыі выбрана 11,8 пр. беларусаў 88,2 прац.

Магілёўскі вокрук Луполаўскі раён: комуністаў 10 пр. *безпартыйных 90 пр* (беларусаў 95 пр.)

Кармянскі раён: комуністаў 3,7 пр. комсамольцаў 11,1 пр *безпартыйных 85,2 пр* (беларусаў 100 прац.)

Журовіцкі раён — комуністаў 3,2 пр. комсамольцаў 12,9 пр. *безпартыйных 83,9 пр* (беларусаў 90,3 прац.)

Клімавіцкі раён (Калінінскі вокруг): комуністаў і комсамольцаў 8,7 пр., *безпартыйных 91,3 пр.* (беларусаў — усё 100 пр.) —

(Ай-яй! таварыш Калінін! кепска брат! твая вокруга і гэтак здрадзіла!)

Полацкі раён: кандыдатаў у комуністы (на'т не комуністаў!!!) 9,5 пр. комсамольцаў — 4,7 пр. *безпартыйных 85,8 пр.* (беларусаў 76,2 пр.) (Звезда № 15). А вось агульныя данныя па перавыбарам па усей Радавай Беларусі, па данным камісарыяту ўнутраных справаў па 6 лютага г.г. (Газ. Звезда № 32): Перавыбрана 604 саветаў. Прымалі вучасьце — 48,2 прац. выбаршчыкаў. Выбрана ўсяго — 9220 сяброў з іх: комуністаў 836 ч. (9,1 прац.) комсамольцаў 931 (10,1 прац.) *безпартыйных 7453 (80,8 прац.) Беларусаў — 8414 (91,3 прац.)*, расейцаў 170 (1,8 прац.) палякоў 195 (2,1 пр.) жыдоў 281 (3,0 пр.), латышоў 98 (1,1 пр.), іншых нацыянальнасьцей 62 (0,7 пр.). Як бачым добра стукнулі сяляне бальшавікоў па „твару“, бо большасьць правялі сваіх даверанных людзей. Комуністы, як відаць па тону газэт,— спусьцілі нос на квінт... Праваліліся самым рашучым способам...

Расстрэлы чырвоных камандзіраў.

2 студня ў Пскоўскім ваенным Судзе закончыўся працэс 174 ваенных чыноў 19 чырвонай брыгады. Абвінавачаны яны ў тым, што калі брыгада была выслана у 1924 годзе „на усьмірэньне“ каля Бабруйску паўстанцаў, якіх не маглі перамагчы „часьці асобага назначэньня Г. П. У (спэцыялісты-ўсьмірыцелі), — дык з дарогі ўжо вярнулася самахоць на месца сваей стаянкі. Ваенны суд прызнаў усіх абвінавачаных вінаватымі і прыгаварыў — 35 да расстрэлу, а 144 у вечную турму. З іх расстраляна было 16 чал., прыгавор над якімі зацьвердзіў камандуючый Пскоўскай ваеннай Округай. Сярод расстраляных: камандзір брыгады Карпінскі-начальнік штаба брыгады Басаў, камандзір „карацельнага“ атраду Яцкаў і 13 чырвоных афіцэраў. Па данным справы відаць, што паўстаньне ўзнялося па поваду надужыцьцяў пры спагоне падаткаў.

Кепскія справы, калі ўжо і сваіх чырвоных камандзіраў прыходзіцца расстрэліваць за непаслушэнства.

ТУТЭЙШАЯ ХРОНІКА.

Паварот Старшыні Ч. Беларускай Рады. 17 г. м. вярнуўся з Варшавы Старшыня Ч. Белар. Рады п. Паўлюкевіч. Старшыня Рады быў у Варшаве 6 дзён. За гэты час ён быў прыняты Міністрам Унутр. Справаў п. Рачкевічам і Міністрам Асьветы п Грабскім Міністру Рачкевічу п. Паўлюкевіч зложыў цэлы рад пажаданьняў у справе палепшаньня беларускага жыцьця, галоўным чынам гаспадарчага характэру, у зьвязку з правядзеньнем прынятага Соймам праэкту зямельнай рэформы. У Міністра Грабскага Старшыня Рады рабіў інтэрвэнцыю ў справе зацьверджаньня 4 настаўнікаў Клецкай Беларускай Гімназіі, якім месцовыя ўлады ад пачатку школьнага года рабілі розныя перашкоды. Інтэрвэнцыя мела пасьпех і п. Міністар згадзіўся зацьвердзіць усіх гэтых настаўнікаў.

У справе выезда на работы ў Францыю. 10 сакавіка выедзе ў Францыю чарговая партыя сельска гаспадарчых работнікаў. У гэтую партыю будзе прынята каля 150 чалавек.

Безрабоцьце. За апошні тыдзень у Вільні зарэестравана 5180 безработных, з якіх толькі 1.753 чалавека атрымліваюць дапамогу. Гэткім чынам за два апошнія тыдні лік безработных у Вільні павялічыўся блізу на 1000 чалавек.

Курс грошаў. 16 лютага за даляр плацілі 7 зл. 33 гр.

новы стыль і на падставе гэтага бальшавікі дазволілі сьвяткаваньне сьвятаў толькі па новаму стылю. Але народ не пайшоў на гэтую правакацыю „жывацаркоўнікаў“ і па даўнейшаму сьвяткуе па старому стылю, разам з сваімі пастырамі, якія засталіся вернымі праўдзівай праваслаўнай веры.

З пэўнасьцю можна сказаць, што гэткага аб'еднаньня, якое ёсьць цяпер у С.С.Р.Р. паміж духавенствам і паствай, ніколі яшчэ ня было. Упалі ўсе соцыяльныя перагародкі і праваслаўны народ, аб'еднаўшыся са сваімі духоўнымі пастырамі, стварыў адзіную і непадзельную Царкву. Бальшавікі кідаюцца на агіднае ашуканства, каб толькі як небудзь разьбіць гэтую еднасьць. Яны называюць духаўнікоў кравапіўцамі. І гэтак асьмеліваюцца гаварыць усе гэтыя Дзержынскія, Лацісы, Сталіны ды іншыя каты на сумленьні якіх ляжаць мільёны замучаных, непавінных ахвяраў.

Зусім ясна, што комунізм ёсьць вучэньне антыхрысьціянскае. Вось, што напрыклад, кажа аб хрысьціянстве найбольш „гуманны“ з бальшавікоў, камісар прасьветы Луначарскі: „Мы ненавідзім хрысьціян. Нават лепшыя з іх павінны быць прызнаны нашымі ворагамі. Яны прапаведуюць любоў да бліжняга і літасьць—тое, што пярэчыць нашым прынцыпам. Хрысьціянская любоў перашкаджае разьвіцьцю рэвалюцыі. Далоў любоў да бліжняга! Тое, што нам патрэбна—гэта ненавісьць. Мы павінны ўмець ненавідзець. Толькі тагды мы пераможам увесь сьвет“.

Пасьля правалу правакацыйнай спробы развяліць царкву знутры, пры помачы „жывацэркоўнікаў“,—бальшавікі скінулі маскі і пачалі адкрытую барацьбу з духавенствам. Яны, з правакацыйнай мэтай, пачалі рабаваць цэрквы, пад пазорам, із'яцьця царкоўных цэннасьцяў. Рабунак гэты яны рабілі насьмяхаючыся над сьвятымі рэчамі, абдзіралі рызы з абразоў, забіралі сьвятыя чашы, крыжы і г. д. І калі духавенства, разам з народам паўстала проці гэтага паруганьня сьвятыняў, — бальшавікі пачалі масамі арыштовываць і расстрэліваць духаўнікоў, наражаючы іх перад тым на страшэнныя мучэньні. Напрыклад: голых сьвяшчэньнікаў на марозе аблівалі вадой пакуль яны не рабіліся лядзянымі слупамі. Распіналі іх перад царквамі і масамі расстрэлівалі. Гэтак ад 1918 да 1920 г. была замучана на сьмерць 26 архірэяў і 1.200 сьвяшчэньнікаў. А за ўвесь час існаваньня бальшавіцкай улады лічба замучаных духаўнікоў дасягае страшэннай цыфры 28.000 чалавек! Не абмінула ўсё гэтае і вышэйшага дастойніка праваслаўнай царквы пакойнага патрыярха Ціхана. Яго таксама ўкінулі у падвал „Чэка“ і зладзейская рука была ўжо занесена над галавой Сьвяціцеля. І толькі пратэсты духавенства ўсяго сьвета, а асабліва ангельскага, уратавалі жыцьцё Патрыярха. Аднак-жа, бальшавікі пазбавілі яго духоўнай ўлады і пасадзілі ў манастыр. І памёр патр. Ціхан у бальніцы пры вельмі загадкавых абставінах Перад сьмерцю да яго нікога не дапускалі ні духавенства ні нават крэўных. У народзе адкрыта гавораць, што бальшавікі замучылі Ціхана і цяпер масы народу ідуць з усіх канцоў, каб пакланіцца праху Мучаніка. Пасьля сьмерці патрыярха бальшавікі надрукавалі сфальшаванае „завешчаньне Ціхана“, але яно было гэтак дрэнна падроблена, што ніхто не дае яму веры.

Ня мала было ахвяраў і сярод каталіцкага духавенства. Гэтак, ня гледзячы на пратэсты ўсяго сьвета, бальшавікі расстралялі польскага ксяндза-прэлата ў Петраградзе — Буткевіча. А засуджанага разам з Буткевічам на сьмерць біскупа Цэпляка савецкая ўлада абменяла на бальшавіцкага злодзея.

(Працяг будзе).

№ 3 ═ НАШ САТЫРЫКОН ═ № 3

Гумарыстычна—сатырычны дадатак да „Беларускага Слова".

У БЕЗПАМЯЦТВЕ.

Судзьдзя. Пакрыўджаны! Скажыце як-жа вас пабілі?

Пакрыўдж. Ды вось п. Судзьдзя як было. Мы, значыцца, з Язэпам—вось ён—гад, абвінавачаны!—паспрачаліся. Бачу бярэцца ён за калок. Я—на ўцёк. А ён, значыцца, дагнаў ды як дзяўбане мяне па галаве. У мяне аж зоркі з вочаў. Як сноп, бяз памяці, так і ткнуўся носам у зямлю. Нічога больш ня помню, бо быў зусім бяз памяці.

Абвінавачаны. Пане Судзьдзя! Вось ён кажа, што быў бяз памяці і паляцеў носам у зямлю...

Пакрыўдж. Але, зусім т'кі бяз памяці. Так і зарыўся носам.

Абвінав. А запытайцеся яго, пане Судзьдзя, ці меў ён пляшку з гарэлкай і дзе яна была?

Пакрыўдж. Але, меў за пазухай. На хрэсьбіны купіў...

Абвінавач. А ці яна засталася цэлай ці пабілася?

Пакрыўдж. Цэлая, хваліць Бога, зусім.

Абвінавач. Як-жа гэта так: бяз памяці зваліўся, ды яшчэ носам, а пляшка за пазухай засталася цэлай?

Пакрыўдж. А пэуне ж! Бо я, як значыцца паляцеў бяз памяці, дык лецячы крыху павярнуўся, каб пляшку часам ня зьбіць..

У СУДЗЕ.

Судзьдзя. Дык вы, абвінавачаны цьвердзіце, што ня кралі? А вось аж трох сьведкаў бачылі, як вы кралі. Што вы на гэта скажаце?

Абвінавачаны Бачылі?!.. А я вось магу прадставіць 20, а нават і больш, сьведкаў, якія гэтага ня бачылі..

Галерэя Партрэтаў беларускіх парлямэнтарыяў і дзеячоў.



Пас. Яр—ч.

Ці-ж ня пекна выглядае?
Пудоў восем вагі мае;
Хмелям чуб яго ўецца
Як ідзе—дык брух трасецца.
Вочы ледзь відаць, а нос—
Дык саўсім у сала ўрос.
Ходзіць важна, быццам пава,
У густ ідзе пасольска страва!
Як індык усьцяж надуты
Падыйдзі—дык пойдзеш струты.
Так і кажа усім тварам:

— „Нікаму я тут ня пара!
Лідэр я і слаўны моўца
Што не як—дык адным слоўцам
Ўраз зьніштожыць я магу.
Знайце ўсе маю вагу!"
Запраўды: вялікі дзеяч —
Знамяніты Ярамеіч!
У палітыку нядаўна ўлез,
А вось бач: ужо Зявес!
З Расеі як да нас прыпёр
Быў—скрамнюсенькі мантёр.
Ведаў як званкі направіць,
Тэлеграфны стоўб паставіць
Чуў што-не-шта і пра „ток",
Словам—знаньнем не далёк
Шансаў на кар'еру мала,
Ды вось бач: пашанцавала! .
Да Антонія прыткнуўся
На Алімпе апынуўся.
Хоць розумам не адзначаўся —
Але спрытным аказаўся,
І пад „высокаю рукой"
Паплыў Ярэма наш гарой!
Ура—палітыкай заняўся
Як прэзэсам Белкому стаўся.
А там—паслом у Сойм папаў...
Так эксцэленцыяй ён стаў..
Адразу быццам ён падрос—
Бяз меры ўверх задраў свой нос.
Час доўгі моўчкі ён сядзеў,
— Пакуль як-што не разглядзеў.
Нарэшце - голас такі даў:
Прамову першую сказаў
А там—шчэ раз і усё болей
Праняўся ён прамоўцы роляй,
І так яе ён спадабаў—
Што трэ—ці не—казаць ўжо стаў.
А каб пякней былі прамовы—
Вучыць пачаў ён розны словы.
А найкрапчэй запала ў вум—
Слаўцо—„індзінвіндуум".

Так спадабаў, што трэ' ці не—
Яго ён суне: знай мяне!
Якое-б ні было пытаньне —
Ён выскажа і свае зданьне.
Хто аб чым—а ён ураз:
Так і сыпе: прошу вас!...
Нарэшце—клюб дзяліцца стаў:
Ярэма ў лідэры папаў.
Зусім бяз меры ў гару узрос,
Аж па макушку задраў нос.
Нельга зусім ні падступіцца
Ні слова людзкага даб'цца.
Усё заняты нейкай „працай"
Ці сядзіць у рэстарацыі...
Наканец—ці-ж не нахальства?
Выйшаў ён з пад рук начальства.
Манарха слухаць перастаў,
Нешта сам рабіць пачаў.
З Рагуляю вайшоў ў хаўрус,
Адкрылі неякі „Саюз",
Газэты сталі выдаваць,
Там сябе рэклямаваць...
Зусім ясны іхні плян:
Скааптаваць сабе сялян,
Пры дапамозе гучных слоў —
Іх галасы дастаць ізноў...
І вось хаця Манарх і лае
Ярэма тону не спушчае.
Хоць газэтка мала варта
І без праграмы—ён упарта
Ўсьцяж у ёй паперу псуе,
Аб чымсь і нешта там малюе.

Аб ім казаць шчэ можна й болей,
Аднак закончым ўжо, даволі!
Здаецца—удаўся наш партрэт—
Ярэму тут пазнае сьвет.
Хай-жа доўга ён жыве,
Слава ўсе шырэй плыве.
Хай будзе тоўст заўседы ён:
Каб цешыць мог САТЫРЫКОН!

Юрыдычныя парады.

Грам. А. Г—му. *Запытаньне*: Ўдава майго брата, які памёр улетку мінулага году, ня толькі не аддае мне зямлі і гаспадаркі, хоць я ёй пакідаў палову рухомасьці і $1/3$ часьць зямлі—але бярэ сабе „прымака". Дзяцей няма. Жыла яна з братам 12 гадоў. Ці мае яна права браць прымака на гаспадарку брата і што і як зраіць?

Адказ: Прымака браць яна можа толькі на сваю „ўдоўю", долю, г. зн. $1/7$ часьць зямлі і $1/4$ будоўлі. На *ўсю* гаспадарку памёршага мужа браць ня можа і наагул — на гэтую гаспадарку правоў уласнасьці ня мае. Падайце ў Суд аб прызнаньні за вамі правоў на насьледзтва пасьля брата і аб адабраньні гаспадаркі ад ўдавы з выдзелам ёй законнай „удоўяй" долі.

Грам. Я. Ч—скай. *Запытаньне*: Мужык кінуў мяне пасьля 3 гадоў сужыцьця з маленькай дачкой. Маемасьці ў яго ніякай ня было і няма. Я з дзіцём засталася зусім на вуліцы. Цяперака я даведалася, што муж служыць у Польшчы паліцыянтам. Пісала яму, ане нічога ня высылае А праз знаёмых наказаў, каб на'т не „безпакоіла" яго, бо нічога ня дасьць. Баюсь, што бярэ на'т нейкія дабаўкі на сямью. Што і як рабіць?

Адказ: Зьвярніцеся да яго начальства, мо згодзіцца без суда выплачываць вам $1/3$ ч. пэнсыі і спэцыяльны дадатак на сямью. Калі ня згодзіцца — падавайце ў Суд, просячы прысудзіць $1/3$ часьць пэнсыі і дадатак на сямью, за ўвесь прошлы час, а также і на будучыну.

Падпіс. З. Т—чу. *Запытаньне*: Бацька памёр гадоў ўжо 30. Я застаўся пасьля яго малалетні (11 гадоў). Зямлёй ўладаў і вёў усю гаспадарку мой старшы брат. Адбыўшы вайсковую павіннасьць я пайшоў служыць. Гаспадарка ізноў засталася пры брату, і я не патрэбаваў падзелу. Аднак я падтрымоўваў сувязь з домам. І хоць ніякай умовы пісьменнай ня было, лічылася што брат арэндуе маю зямлю. Ад часу да часу ён нешта прысылаў мне, а часам я пасылаў на палепшаньне гаспадаркі Некалькі разоў я прыежджаў у госьці. Разам будавалі новы дом і гумно. Я вярнуўся дамоў у 1923 годзе з Вайгарыі (быў у арміі Врангэля). З братам мы паладзілі, аднак не дзяліліся. Увосень мінулага г. брат памёр. Цяпераka яго сын проста выгнаў мяне і ня хоча нічога даць кажучы што я страціў правы па даўнасьці Што рабіць і як?

Адказ: Калі можаце даказаць тое, аб чым пішаце, г. зн. што атрымлівалі ад брата што-колечы за карыстаньне сваей часткай тым самым чынам—не пераставалі лічыцца ўласьнікам, а брат карыстаўся часова і залежна ад вас — падавайце ў Суд — аб адабраньні сваей часьці. Бо пры такіх варунках даўнасьці няма Даказваць трэба: сьведкамі паштовымі квітанцыямі і г. д. Доказам таго што вы не страцілі сваіх правоў будуць р а з а м з і н ш ы м і і квітанцыі на грошы якія вы высылалі брату, а таксама і тое што вы р а з а м будаваліся на супольныя грошы.

Падп. Ал. Швакель. Адказ на Вашае запытаньне знойдзеце у № 1, у аддзеле „Юрыдычных парад", які адначасна Вам пасылаецца.

Паштовая скрынка.

Асмалоўцу. Блашчаніцы. Авласюку. Казакевічу, Крэмзе, сьв. Адэльскаму. *Пробныя нумары Вам выслалі. Калі прышліце падпіску, дык будзем высылаць і далей. Папярэдніх нумароў „Бел. Слова", (№№ 1 і 2) засталася вельмі мала і дзеля гэтаго яны могуць быць высланы толькі падпісчыкам.*

Студэнскату Дому ў Празе. Просьбу Вашу спаўняем. Будзем высылаць Вам па 2 экзэмпляры „Белар. Слова", пачынаючы ад № 1

Жундалку ў Чэха Славакіі. Газэту Вам пасылаем, але „Lidove Listy" да гэтага часу яшчэ не атрымалі.

Ад Юрыдычнага Аддзела Ч. Б. Рады

У апошні час Юрыдычны Аддзел завалены просьбамі аб парадах, якія паступаюць ня толькі ад падпісчыкаў, але і ад чытачоў газэты.

Ня маючы магчымасьці адказаць на ўсе гэтыя запытаньня, мы папераджаем усіх нашых чытачоў, што парады намі будуць давацца **б я з п л а т н а т о л ь к і п а д п і с ч ы к а м** *газэты.*

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк Я. Баеўскага, Савіч 8, Выдавец Ч. Бел. Рада.